УДК: 821.161.3;94(476)"1917"(07)

**М. Я. Сяменчык**

## АСВЯТЛЕННЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ПАДЗЕЙ 1917 ГОДА НА БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНАЙ ВУЧЭБНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## INTERPRETATION OF REVOLUTIONARY EVENTS OF 1917 IN BELARUS IN CONTEMPORARY MANUALS

*У артыкуле акцэнтуецца ўвага на памылковых тэзісах, якія ўтрымліваюцца в большасці дапаможнікаў ВНУ па айчыннай гісторыі, а таксама выкладаюцца навуковыя верафікаваныя палажэнні, якія даюць магчымасці адэкватна ацэніваць асаблівасці рэвалюцыйнага працэса на Беларусі.*

*The article focuses on the falsificated and erroneous theses which are contained in the higher education institution textbook of History of Belarus. The author gives scientific and varificated statements which afford an opportunity of adequate estimation of the revolutionary process in Belarus.*

Пад уздзеяннем ўсеагульнага крызісу гістарычнай навукі, які меў месца на постсавецкай прасторы ў пачатку 90-х гг. ХХ ст. [1, с. 46], асобныя яе праблемы страцілі прыярытэтную значнасць і больш амаль не даследаваліся. Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Рэспублікі Беларусь прафесар А. А. Каваленя ў сваім выступленні 2 лістапада 2007 г. на міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі канстатаваў, што «ў апошняе пятнаццацігоддзе айчынная гістарыяграфія не мела значных дасягненняў у тэарэтычным асэнсаванні рэвалюцыйных падзей 1917 г.» [2, с. 46].

У азначаны час з друку выйшлі манаграфіі І. М. Ігнаценкі [3], [4] і М. Я. Сяменчыка [5], [6]. Асобныя фрагменты праблем былі закрануты ў манаграфіях А. М. Сарокіна, М. П. Касцюка, С. С. Рудовіча, А. Ф. Вішнеўскага [7], у нешматлікіх калектыўных працах [8]. Тое, што іх яднае, гэта – адыход ад марксісцка-ленінскай метадалогіі і панаваўшых канцэпцый, паказ асаблівасцей рэвалюцыйных працэсаў на Беларусі і інш. Аднак гэтыя якасці не зрабіліся прыцягальнымі для іншых аўтараў і асноўная маса літаратуры, асабліва вучэбнай, па-ранейшаму грунтуецца на здабытках гісторыі КПСС.

У 2002 г. прафесар М. С. Сташкевіч, аналізуючы стан гістарычнай навукі, звярнуў увагу на асобую актыўнасць гісторыкаў, якія згуртаваліся вакол грамадскіх арганізацый, накшталт «Гістарычных ведаў», з уласцівым ім «дагматызмам, прыхільнасцю да старых, класавых падыходаў у ацэнцы гістарычнага мінулага, наяўнасцю абмежаванага метадалагічнага інструментарыя» [9, с. 31]. Па словах прафесара Р. У. Карзенкі, «адбылася свайго кшталту «бальшавізацыя» гісторыі рэвалюцыі, у выніку чаго адыйшлі на другі план многія аспекты рэальнай рэчаіснасці, без уліку якіх немагчыма комплекснае разуменне гістарычнага працэса» [10, с. 15]. Натуральна, што і выкладанне ў ВНУ гэтых пытанняў не магло быць здавальняючым ні ў тэарэтычным, ні ў выхаваўчым сэнсе.

У 2004 г. паспяховую спробу змястоўнага і даказальнага асвятлення падзей Лютага-Кастрычніка прадпрынялі магілёўскія навукоўцы [11]. Я. І. Трашчанок першым з айчынных гісторыкаў меў мужнасць заявіць, што большасць твораў па гісторыі савецкай эпохі – ідэалагізаваныя, ілюзорныя і сфальсіфікаваныя. Усталяванне камуністычнай дыктатуры ён звязвае з Вялікай расійскай рэвалюцыяй, якая, на яго думку, складалася з дзвюх паслядоўных фаз – Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. Пры гэтым ніякіх заканамернасцяў у іх ажыццяўленні аўтар падручніка не вылучае [11, с. 18-19]. Праўда, у характарыстыцы палітычнай сітуацыі на Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі Я. І. Трашчанок не заўсёды дакладны, калі піша пра дзейнасць акцябрыстаў і неіснаваўшага Саюзу рускага народа, пра дапамогу яўрэйскай буржуазіі Бунду [11, с. 22], але ў галоўным ён мае рацыю – роля мясцовых бальшавікоў у рэвалюцыі была невялікай, а вызначальным фактарам ва ўсталяванні тут Савецкай улады з'явілася перамога іх таварышаў у Петраградзе [11, с. 20].

Варта адзначыць, што ў асэнсаванні прычын Кастрычніцкай рэвалюцыі аўтар не ўтрыруе факту «сацыялістычнага выбару» народаў Расіі, у тым ліку і Беларусі, а звяртае ўвагу на «прыняцце» імі Савецкай улады, якое ўяўляла сабою «дастаткова супярэчлівы і складаны працэс» [11, с. 27]. Не выклікае сумненняў аўтарскі тэзіс аб перакосах у гістарыяграфіі, дзе, акрамя іншага, «міфалагізаваная, містыфікаваная гісторыя партыі фактычна замясціла грамадзянскую гісторыю» [11, с. 27]. Другі тэзіс аб існаванні схемы, «якая атаясамляе гісторыю Беларусі з гісторыяй беларускага нацыянальнага руху», на нашу думку, занадта перабольшаны. У цэлым матэрыялы дапаможніка «История Беларуси» ўтрымліваюць цікавую інфармацыю як для засваення, так і для роздуму. Пры гэтым аўтары не прэтэндуюць на «ісціну ў апошняй інстанцыі», а лічаць «барацьбу думак» натуральнай з'явай [11, с. 16].

Большасць іншых аўтарскіх калектываў скарыстала матэрыялы зборніка дакументаў і артыкулаў «Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции», «Нарысаў гісторыі Беларусі», «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», часопісных публікацый, але ў той самы час пакінула практычна нязменнай канцэпцыю Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, у многім запазычаную з гісторыі КПСС [12]. Найбольш істотныя ў метадалагічным, факталагічным, метадычным і выхаваўчым плане недахопы ўласцівы падручніку «Гісторыя Беларусі» у 2 частках пад рэдакцыяй Новіка Я. К. і Марцуля Г. С. [13] [14]. Змешчаным у іх матэрыялам аб падзеях 1917 г. уласціва прысутнасць палажэнняў, адкінутых яшчэ ў мінулым стагоддзі – аб кіруючай ролі бальшавікоў у Лютаўскай рэвалюцыі, двоеўладдзі, Саветах як органах улады ў дакастрычніцкі перыяд і інш. Так, ва ўводзінах, замест характарыстыкі новых дасягненняў навукі, аўтары акцэнтуюць увагу на аджытых ідэях эпохі «халоднай вайны», накшталт той, што Кастрычніцкай рэвалюцыя – «вынік дзеянняў адзінага сусветнага жыдоўска-масонскага бальшавіцкага загавору». «Сучасная гістарычная навука, – заключаюць аўтары, – не можа адказаць на пытанні аб ролі масонаў у Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях» [14, с. 22]. Відавочна, што роля ў іх «жыдоў» сумненняў выклікаць не павінна.

У адрозненне ад Новіка Я. К. і Марцуля Г. С., мы лічым, што абедзве рэвалюцыі не былі фатальна непазбежнымі. Ні аўтарытарны, ні дэмакрытычны рэжымы не вычарпалі свайго патэнцыялу. Пратэстны рух рабочых сталіцы 23-27 лютага, падтрыманы вайскоўцамі, перарос ва ўзброенае паўстанне і абумовіў усталяванне новага ладу па ўсёй краіне, у тым ліку на Беларусі. Не апошнюю

ролю ў «звяржэнні» манархіі адыграў Мікалай II, які не стаў абвастраць узніклы крызіс і адрокся ад трона. У гэтай сувязі не варта перабольшваць ролі ўсяго народа ў рэвалюцыі, як гэта робяць аўтары. Да прыкладу, усім пластам насельніцтва Беларусі, франтавым і тылавым вайскоўцам засталося толькі *прыняць* (выдзелена намі – М. С.) новы дзяржаўны лад і падтрымаць Часовы урад у здзяйсненні абвешчанай ім Дэкларацыі ад 2 сакавіка 1917 г. [5, с. 16-26].

Змешчаныя ў падручніку матэрыялы аб Лютаўскай рэвалюцыі пабудаваны на надуманых тэзісах аб «змове» меншавіцка-эсэраўскага кіраўніцтва Саветамі з буржуазіяй пад час стварэння «Часовага буржуазнага ўрада», аб «ворагах рэвалюцыі». Генералітэт, які разам з усёй арміяй прысягнуў на вернасць Часоваму ураду, названы «рэакцыйнай ваеншчынай». Нават такі паслядоўны ленінец, якім з'яўляўся член-карэспандэнт НАН Беларусі П. Ц. Петрыкаў, і той звярнуў увагу аўтараў на змешчаныя імі аджытыя штампы аб Саветах як органах улады і «двоеўладдзі» [15, с. 85]. Ад сябе дададзім, што ў рэвалюцыйнай актыўнасці мінскіх бальшавікоў і «баявых дружын» рабочых у пачатку сакавіка, калі практычна ўвесь народ вітаў рэвалюцыю, патрэбы не існавала [5, с. 26-32]. Аўтары неправамерна пачынаюць асвятленне рэвалюцыйных перамен са стварэння Саветаў, а не грамадскіх камітэтаў. Зусім неабгрунтаванай выглядае роля рабочага класа, быццам ён стаяў «на чале барацьбы за развіццё рэвалюцыі». На справе, на Беларусі ён знаходзіўся пад вызначальным уплывам РСДРП, Бунда, ПС-Р і інш. партый, абраўшых дэмакратычны шлях вырашэння ўласных і агульнаграмадскіх праблем. Невыпадкова таму, за паслялютаўскі час тут не адбылося ніводнага антыўрадавага выступлення рабочых [5, 144-156].

У асвятленні ліпеньскага крызісу – пануюць тыя ж партыйныя штампы, быццам «буржуазія атрымала ўсю паўнату ўлады» [13, с. 14], а потым задумала ўсталяваць сваю дыктатуру на чале з Карнілавым.

Аўтарскае бачанне падзей восені 1917 г., калі «па ўсёй Расіі, у тым ліку і Беларусі, праходзілі масавыя антыўрадавыя выступленні – дэманстрацыі, мітынгі рабочых, сялянскія паўстанні» [14, с. 17], не пацвярджаецца фактамі айчыннай гісторыі. А тэзіс, быццам «да кастрычніка 1917 г. выступленні пралетарыяту, сялянства Беларусі і салдат Заходняга фронту згуртаваліся ў адзіную плынь, была створана армія сацыялістычнай рэвалюцыі» [14, с. 16], зусім беспадстаўны і запазычаны, можна меркаваць, з «Истории ВКП(б)».

У тым жа рэчышчы характарызуецца Часовы ўрад як «буржуазны», выключна адмоўна падаецца яго ваенная палітыка, зусім не асветлены яго станоўчыя дасягненні ў дэмакратызацыі краіны, падрыхтоўцы да вырашэння сацыяльна-эканамічных рэформ, а таксама рэальныя прычыны зніжэння яго аўтарытэту восенню 1917 г.

Мэтазгоднасць уключэння ў падручнік «версіі» аб германскім фінансаванні расійскай рэвалюцыі вядома толькі аўтарам, а мусіраваць гэтыя чуткі – па-за межамі навуковай этыкі. Як піша Новік Я. К. у асобным артыкуле, «нават калі дапусціць, што расійскія рэвалюцыянеры сапраўды атрымлівалі грошы некаторых фінансавых вараціл Германіі, то гэтыя грошы выкарыстоўваліся не супраць Расіі і расійскага народа, а ў інтарэсах Расіі і яе народа» [10, с. 7]. Такім чынам, аўтар выступае на баку прыхільнікаў «версіі» аб германскіх спонсарах Кастрычніцкай рэвалюцыі.

На думку Новіка Я. К., ні адна з «версій» Кастрычніцкай рэвалюцыі – марксісцка-ленінская, ліберальна-буржуазная, «сіяністка-масонскай змовы супраць Расіі» – «да сапраўднай навукі не маюць сур'ёзнага дачынення». «Стварыць навуковую, прызнаную усімі канцэпцыю Кастрычніцкай рэвалюцыі, – як яму уяўляецца, – «не удалося нікому ды і, бадай, не удасца яшчэ доўгі час, пакуль у грамадстве будуць бедныя і багатыя, а ў свядомасці людзей – ідэя сацыяльнай справядлівасці» [10, с. 5]. Але сам ён не стаў чакаць «светлай будучыні» і, як вынікае з падручніка, высунуў сваю «версію». Паводле яе, «рэвалюцыя ў Расіі не магла не адбыцца. Яна была падзеяй непазбежнай, заканамернай» [10, с. 5].

Між тым яшчэ ў 1991 г. загадчык аддзела Інстытута расійскай гісторыі РАН прафесар В. П. Данілаў крытыкаваў ідэю «непазбежнасці і заканамернасці», прызнанне якой «для гісторыка практычна азначае аўтаматычнае адабрэнне усяго таго, што здзейснілася, і толькі таму, што яно здзейснілася. Гісторыя прадастаўляе людзям магчымасць выбару, – казаў ён, – і ўжо таму патрабуе ад гісторыка аналізу і ацэнкі не толькі варыянту, які адбыўся, але і варыянтаў, якія не адбыліся. Інакш гісторыя набыла б нейкі містычны характар, а заняткі ёю страцілі б сэнс» [16, с. 13].

У дадзеным выпадку больш абгрунтаванай выглядае тая думка: калі што і з'яўлялася заканамерным і непазбежным у рэвалюцыйным працэсе, дык гэта узброенае паўстанне бальшавікоў, бо ні адна партыя, акрамя ленінскай, не ставіла сабе на мэце прыход да улады гвалтоўным шляхам. Такім чынам, падзеі 25-26 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе мелі ўсе прыкметы перавароту. Іншая справа, што па зместу, характары і наступству пераўтварэнняў ён набыў уласцівасці рэвалюцыі. А да таго часу расійская грамадскасць успрыняла падзеі ў Петраградзе менавіта як пераварот, аб чым сведчыць тагачасны друк і архіўныя дакументы [6, с. 5-16].

Можна сцвярджаць і аб адсутнасці шырокай сацыяльнай базы бальшавікоў сярод рабочага класу Беларусі. Інакш ім не спатрэбілася б фарміраваць Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты, а затым пераабіраць Саветы. Выказванне часткі працоўных у падтрымку дэкрэтаў II з'езда Саветаў і Часовага рабоча-сялянскага ўрада – СНК на чале з У. І. Леніным было выклікана спадзяваннямі на фарміраванне аднароднага сацыялістычнага ўрада і забеспячэнне склікання Устаноўчага сходу. Па словах гісторыка М. М. Смальянінава, «для бальшавікоў важнейшым быў унутраны фронт барацьбы за уладу», чым пагроза нямецкага наступлення [2, с. 76].

У гэтай сувязі, палажэнне аб «дэмакратычным выбары развіцця, які вызначыў II з'езд Саветаў» [14, с. 23], даволі спрэчнае і слаба аргумен-таванае. Сам У. І. Ленін у «Лісце да таварышаў» ад 24 кастрычніка, падкрэсліваў, што «... ў чарзе стаяць пытанні, якія не нарадамі вырашаюцца, не з'ездамі (хаця б нават з'ездамі Саветаў), а выключна народамі, масай, барацьбой узброеных мас. ...Узяцце ўлады ёсць справа паўстання; яго палітычная мэта высветліцца пасля ўзяцця».... [17, с. 435]. Заўважым пры гэтым, што сялянскія Саветы, якія прадстаўлялі пераважную большасць працоўнага насельніцтва Расіі, катэгарычна адмовіліся ад удзелу ў II з'ездзе Саветаў, аддаўшы перавагу падрыхтоўцы да выбараў ва Устаноўчы сход. «Выбар», які адштурхнуў у апазіцыю да кіруючай партыі пераважную большасць насельніцтва і выклікаў грамадзянскаю вайну, нельга прызнаць дэмакратычным. І па-другое, калі б усе грамадзяне Расійскай рэспублікі прызналі ленінскі СНК і першыя дэкрэты

запраўды законнымі, то іх удзелу ў выбарчай кампаніі ва Устаноўчы сход папросту не адбылося б. Савецкаму ўраду не давялося б разганяць парламент і тым, па словах Л. Троцкага, здзяйсняць 5 студзеня 1918 г. «дадатковую рэвалюцыю» [18, с. 207].

Адносна заявы, што «народы Расіі падтрымалі сацыялістычны выбар» [14, с. 24], то аўтары папросту прыпісалі гэтыя словы В. М. Чарнову [19].

Мае рацыю М. С. Сташкевіч, калі кажа аб тым, што «вынікам Кастрычніка 1917 г. было афармленне новага грамадска-палітычнага і эканамічнага ладу», што «Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла *перспектыву* будаўніцтва сацыялістычнага грамадства» [9, с. 31]. Спатрэбіўся час, каб працоўныя пасля перажытой нямецкай, а затым польскай акупацыі зразумелі і адчулі, што Савецкая ўлада – стаіць на абароне іх інтарэсаў.

У падручніку змешчаны шэраг памылак факталагічнага кшталту: «Загад № 1» Мінскага Савета быў выдадзены не 25 [14, с. 18], а 26 кастрычніка [6, с. 9]. ВРК Заходняга фронту ўзначаліў А. Мяснікоў і толькі потым – К. Ландэр. [6, с. 11-12]. Пасяджэнне выканкамаў азначаных з'ездаў адбылося не 27 [14, с. 21], а 26 лістапада, а створаны на ім орган улады меў скарочаную назву «Аблвыкамзах» [6, с. 11]. Выбараў 11 лістапада Віцебскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў не было. Мала таго, паводле ўспамінаў бальшавікоў, «у кастрычніцкія дні ў Віцебску не было роўна ніякай апоры ў рабочых масах. Рабочыя былі супраць нас» [6, с. 18]. Указаных органаў улады Часовага ўрада (канцылярыі губернскіх камісараў, губернскія, гарадскія, павятовыя, валасныя і пасялковыя камітэты) [14, с. 21] не існавала наогул. Стаўка не прадпрымала ніякіх спроб «аказаць супраціўленне». Не адпавядае рэчаіснасці безапеляцыйная заява, быццам пасля Кастрычніка «ўтварылася чыста беларуская плынь», якая паставіла сваей мэтай абвясціць незалежнасць Беларускай рэспублікі» [14, с. 29]. З разгромам першай польскай дывізіі «пажар вайны», як пішуць аўтары [14, с. 35] не «быў патушаны», а працягваўся. У лютым 1918 г. легіянеры разбілі часці Чырвонай Арміі пад Асіповічамі і нават акупіравалі паўднёва-заходнюю частку Мінска [6, с. 117].

Па вялікім рахунку, прасцей напісаць новы падручнік, чым пералічваць змешчаныя ім недахопы. Тут пануюць класава-партыйныя ацэнкі органаў улады, генералітэта і афіцэрскага корпусу, небальшавіцкіх і іншых арганізацый, якія дзейнічалі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. Наогул, гісторыя Беларусі названага перыяду ўяўляе сабой галоўным чынам гісторыю партыі бальшавікоў. Аб тым жа сведчыць і рэкамендаваны студэнтам спіс літаратуры, у падаўляючай большасці даперабудовачнага часу. Непаслядоўнае асвятленне падзей, відавочная («крытыкі Леніна», «крытыкі бальшавікоў», «бальшавізму») апалогія аджытой ідэалогіі, суб'ектывізм, безпадстаўнасць высноў, факталагічныя памылкі і іншыя хібы ў лепшым выпадку толькі ўскладняць іх (падзей) асэнсаванне студэнтамі.

У ліку прычын невысокага ўзроўню асвятлення падзей рэвалюцый 1917 г. – дэфіцыт у аўтарскіх калектывах кампетэнтных навукоўцаў і метадыстаў. Адсутнасць новых даследаванняў стрымлівае выданне зборнікаў дакументаў і дапаможнікаў для самастойнай працы студэнтаў. Тыя, што выйшлі ў савецкія часы, складзены, мякка кажучы, тэндэнцыйна і «ежы для розуму» не даюць. Для нас, выкладчыкаў ВНУ, заклапочаных утварэннем вучэбна-метадычных комплексаў, уяўляецца надзвычай важным наяўнасць падручніка, які б адпавядаў не толькі адукацыйным, але і выхаваўчым мэтам. Між тым, усім існуючым дапаможнікам у той ці іншай ступені ўласцівы рудыменты ідэалогіі партыйнай.

Як слушна заўважыў прафесар А. Ф. Вішнеўскі, «...праграмы сучасных камуністычных партый не ўтрымліваюць сур'ёзных напрацовак па змяненню погляду на пройдзены гістарычны этап. Калі здарыцца так, што гэтыя партыі вернуцца да ўлады, то многае з мінулага можа паўтарыцца, бо камуністы імкнуліся зрабіць яе для сябе абсалютнай, нязменнай, прычым над усімі сферамі чалавечага жыцця – ад палітычных паводзін да асабістай думкі пра сусвет» [20; с. 6]. У гэтым сэнсе абвяржэнне існуючых партыйных «версій» адносна рэвалюцыйных падзей 1917 г. – не апошняя задача неангажаваных гісторыкаў.

Апошнім часам на канферэнцыях [2] [10] [21] і ў навуковай перыёдыцы ўздымаюцца пытанні аб аднаўленні і ўзбагачэнні дыялектыка-матэрыялістычнай метадалогіі, адмовы ад палітызацыі і ідэалагізацыі гісторыі [1, с. 3-6].

Як нам уяўляецца, існуючы метадалагічны плюралізм зусім натуральны і ў цэлым спрыяе ўсебаковаму асвятленню гістарычных падзей і з'яў. Іншая справа, што менавіта ў нашы дні, калі ў грамадстве ўсталяваўся сацыяльны мір, грамадска-палітычная і эканамічная стабільнасць, калі свята Кастрычніцкай рэвалюцыі заклікана аб'ядноўваць увесь народ, у грамадазнаўчай супольнасці актуалізуецца мэтазгоднасць і магчымасць выпрацоўкі адпаведнай метадалогіі, якая б грунтавалася на прынцыпах аб'ектыўнасці, гістарызму і сістэмнасці.

Нельга не пагадзіцца з абгрунтаваннем прафесарам У. Н. Сідарцовым неабходнасці актыўнага выкарыстання каштоўнаснага падыходу да асэнсавання гісторыі [22, с. 55].

Мяркуем, што рэалізацыя гэтага метада ў спалучэнні з іншымі пры даследаванні Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыі дазволіць асэнсаваць дасягненні і страты кожнай з іх з пункту гледжання агульначалавечых інтарэсаў, партый, сацыяльных і нацыянальных пластоў і ўсяго народа ў цэлым.

Такім чынам, выкарыстанне новай метадалогіі і новых падыходаў да рэвалюцыйных падзей павінна стаць вызначальным сродкам у пераасэнсаванні літаратуры, пакінутай нам у спадчыну ад партыйных навукоўцаў, даследаванні актуальных тэм і стварэнні на іх аснове дасканалых у тэарэтычным, метадычным і выхаваўчым плане падручнікаў для вышэйшых і іншых навучальных установ.

---

1. Смяховіч, М. Гістарычныя даследаванні ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. Тэарэтыка-метадалагічныя катэгорыі і прынцыпы, тыпалогія // Гісторыя: праблемы выкладання /М. У. Смяховіч. – 2007. – № 10.

2 Октябрь 1917 года в судьбе мировой цивилизации. (к 90-летию Октябрьской революции): материалы Международн. научно-практ. конф., Минск, 2 ноября 2007 г./ редкол. М.П. Костюк (гл. ред.), Н.В. Смехович( зам. гл. ред.) [и др.] . – Минск, 2008.

3. Ігнаценка, І. М. "Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: асаблівасці і вынікі / І. М. Ігнаценка. — Мінск: БелНДЦДАС, 1995.

4. Игнатенко, И. М. Революция в историческом процессе. Очерки / И. М. Игнатенко. – Минск, 1997.

5. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.) у 2 ч. Ч. І. Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму / М. Я. Сяменчык. – Мінск, БДПУ, 2001.

6. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.) у 2 ч. Ч. ІІ.

Грамадска-палітычнае жыццё ва умовах складвання таталітарнага рэжыму / М. Я. Сяменчык. – Мінск, БДПУ, 2001.
7. Сарокін, А. М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская веска: Ад дэкрэта да кодэкса аб зямлі (1917- 1990-я гады / А. М. Сарокін. Мн., 1999; Касцюк, М. П. Бальшавіцкая сістэма улады на Беларусі /М. П. Касцюк. – Мінск: “Экаперспектыва”, 2000; Рудовіч С. С. Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі у 1917 г. / С. С. Рудовіч. Мн. 2001; Вішнеускі А. Ф. Асаблівасці палітыка-прававога рэжыму савецкай дзяржавы і яго вытокі (1917-1953 гг.) / А. Ф. Вішнеускі. – 2-е выд., выпр. і дап. - Мінск : Тэсей, 2006.
8. Ладысеу, У. Ф., Брыгадзін, П. І. На пераломе эпох: станауленне беларускай дзяржаунасці (1917–1920 гг.). – Мінск: БДУ, 1999; Гісторыя сялянства Беларусі. Са старажытных часоу да нашых дзён: У 3 т. / Пад рэд. В.П. Панюціча. – Мінск: Бел. навука, 2002.- Т. 2.; Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917 – 1945 гг. гал. рэдактар М. П. Касцюк. – Мінск “Экаперспектыва”. 2006.
9. Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця : Матэрыялы рэспуб. навук. канф. У 4 Ч. Ч. І / пад рэд. І. П. Крэня, У. І. Навіцкага, І. А. Змітровіча. – Гродна: ГрДУ, 2003.
10. Расійскія рэвалюцыі 1917 года у лёсе Беларусі (матэрыялы “круглага стала”, які адбыуся 19 верасня 2007 г. у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі) // Беларускі гістарычны часопіс, 2008 – № 1.
11. История Беларуси : учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высш. образования. В 2 ч. Ч. 2 / Я. И. Трещенок, А. А. Воробьев, Н. М. Пурышева, М. И. Матюшевская ; под ред. Я. И. Трещенка. - Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2005.
12. Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стагоддзі: Курс лекцый / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеу, П. І. Зялінскі і інш. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002; Ковкель, И. И. История Беларуси : с древнейших времен и до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – 6-е изд. – Минск : Аверсэв, 2006; Чигринов, П. Г. Очерки истории Беларуси учеб. пособие / П. Г. Чигринов. – 3-е изд., испр. – Минск : Выш. шк., 2007.
13. Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоу – па люты 1917 г. : падручнік / Я. К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2007.
14. Гісторыя Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. Люты 1917 г. – 2006. : падручнік / Я. К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2007.
15. Петриков, П. Т. Очерки новейшей ис-ториографии (1990-е – начало 2000-х гг.) / П. Т. Петриков. – Минск : Белорус. наука, 2007.
16. Гломозда, В. Г. Альтернативы в истории // Преподавание истории в школе. – 1991. - № 5.
17. Ленин, В. И. Полн. собр. соч. Т. 34.
18. Троцкий, Л. Д. К истории русской революции. – М.: Политиздат, 1990.
19. Чернов, В. М. Перед бурей. Воспоминания. Издательство имени Чехова. Нью-Йорк, 1953.
20. Вішнеускі, А. Ф. Асаблівасці палітыка-прававога рэжыму савецкай дзяржавы і яго вытокі (1917-1953 гг.) / А. Ф. Вішнеускі. – 2-е выд., выпр. і дап. - Мінск : Тэсей, 2006.

21. Программа Второй Международной научной конференции "Методология исследований истории Беларуси: проблемы, достижения, перспективы". Минск, 22 – 23 октября 2008 г.
22. Сидорцов, В. Т. Методологизация мышления как магистральное направление в развитии белорусской историографии // Гісторыя: праблемы выкладання. 2008. № 9.